**Віктар Шніп**

# Наш Максім гаворыць: — Гу!

Вершы

Мінск

“Юнацтва”

1999

## НАШ МАКСІМ

Наш Максім гаворыць:-- Гу!
Гэта значыць:--Я магу!
Што наш можа немаўля,
Ён раскажа ўсім пасля,
Бо цяпер гаворыць нам:
--Мама, ам, дай, мама, ам!

## У ВЕРАНІЧКІ СВЯТА

Скачуць жабкі па балоце,
Верабейчыкі—па плоце.
Скача зайчык па паляне,
Веранічка—па дыване.
У дзяўчынкі сёння свята—
Ёй прынёс сабачку тата.

## МАМА МНЕДАПАМАГАЛА

Я памыла ўсе талеркі,
Тата купіць мне цукеркі.
Есці іх адна не буду,
Пачастую маму Люду.
Мама мне дапамагала —
Чысты посуд выцірала.

## РЫГОРКАВА ГОРА

У маленькага Рыгора
З раніцы сягоння гора.
--Што за гора?—дзед спытаў.
--Я мультфільмікі праспаў.

## КУРАНЯТЫ

З раніцы ля хаты
Ходзяць куранятыー
Курыцыны дзеткі,
Жоўтыя, як кветкі.
Клічу куранятак,
Сыплю ім зярнятак.
Ды яны не чуюцьー
Між сабой ваююць.

## ТАТА З МАМАЙ У КІНО

Тата з мамай у кіно,
Я сяджу, гляджу ў акно.
Мне ісці на двор пара,
Там гуляе дзетвара.
Я збудую дом з пяску
І аддам яго катку,
Што хаваецца ў кусце,
З белым бантам на хвасце.
А як вернуцца дамоў,
Я скажу бацькам ізноў:
--Не хадзіце вы ў кіно,
Наглядзеўся я ў акно!

## ВОЖЫК

Пад густой ялінкай вожык
Аб каменьчык вострыць ножык.
Захацеў ён зрэзаць шышку
І парадаваць зноў мышку.
Ды шкада, бядак, не знае:
Ён, як птушка, не лятае.

## СІНІЦА

Зноў у нашым у садочку
На ігрушы,у цянёчку,
Спаць сабралася сініца.
Ды не спіцца ёй, не спіцца.
Кінуўшы свае забаўкі,
Вераб'і дзяўбуць трускаўкі.

## МУХА

Сёння муха-трапятуха
Мне ўвесь дзень гудзе на вуха,
Што на сцежцы ля ракі
Заяц садзіць буракі.
Дзве сарокі-белабокі
Ля кустоў пасуць аблокі,
А вясёлы наш баран
Нам пафарбаваў паркан...
Эх ты, муха-трапятуха,
Не гудзі ты мне на вуха,
Бо я знаю ад слана,--
Словы ўсе твае—мана.

## ГОСЦІ

Да маленькай Веранічкі
Пазляталіся сінічкі,
Бо дзяўчынка Веранічка
Шчабятуха, як сінічка.
А да хлопчыка Рыгоркі
Пазбягаліся ваверкі,
Бо маленькі наш Рыгорка
З раніцы смяецца звонка.
А да нашай плаксы Веры
Нават воўк-гуляка шэры
Зазірнуць у дом баіцца,
Каб у слёзах не ўтапіцца.

## МЫШЫ КУПІЛІ ЛЫЖЫ

На лясным базары мышы
За мядзяк купілі лыжы.
Лыжы ў норку валакуць,
Лыжы ў норку не ідуць.
І пішчаць, злуюцца мышы:
--Воўк прадаў благія лыжы!

## САЛОДКІ МАК

Ходзіць певень па двары
І глядзіць, як камары
Мак, спяваючы, таўкуць.
Пеўню маку не даюць.
Певень кажа камарам:
--Дайце маку, я вам дам
Чарвячка, як парсючка,
І жучка, нібы бычка.
Ды не чуюць камары—
Мак салодкі на двары.

## ЛІСА-ПРЫГАЖУНЯ

Маладзенькая ліса
Сабірацца стала ў госці.
Не ліса—а краса,
Залаценькі хвосцік.

Завушніцы начапіла.
А караляў—не знайшла.
Стала лісцы ўсё няміла,
Слёзак рэчку праліла.

Запаліўшы свій ліхтарык,
Пад лістком гудзе камарык:
--Плачаш, ліска, ты дарма,
Прыгажэй цябе няма.

## ЗАЙЧЫКІ

Стук-грук... Па лясной дарозе
Едуць зайчыкі на возе,
Пабылі на кірмашы,
Прадавалі гладышы.
Прадалі на тры рублі,
Воз капусты набылі.

## КОТ ІШОЎ ПА РЫБУ

Дыбу, дыбу, дыбу—
Кот ішоў па рыбу,
І як можна цішай
Следам беглі мышы,
Котку неслі тапкі,
Каб не змерзлі лапкі
Ля вады сцюдзёнай
У траве зялёнай.

## ПАПУГАЙ ГОША

Гавару я папугаю:
--Папугайка-папугай,
Ты за мною паўтарай:
--Я харошы, я харошы...
Ды сваё гаворыць Гоша:
--Дай арэх, дай арэх...
--Ну і Гоша, проста смех!

## НЕ СКВАПНІК

--На двары даўно зіма,
А ў мяне канькоў няма!—
Брату скардзіцца Ігнат.
А Ігнату кажа брат:
--Я не сквапнік у бацькоў,
Мне не трэба двух канькоў,

Мець сягоння згодны я
Аднаго хаця б каня!

## ЖУК-МАРАХОД

Жук на лісціку сядзіць,
У вусы свае гудзіць:
--Жу-жу-жу! Жу-жу-жу!
Не баюся я дажджу.

І як дождж з хмурын паліў,
Жук на лісціку паплыў:
--Я не жук, я—мараход.
Лісцік мой—мой параход!

## ГАСЦІННЫ КАМАР

Жыў пад лісцікам камар,
Меў камарык самавар,
Запрашаў у госці ўсіх
Мушак і жучкоў малых.
Частаваў гасцей гарбаткай
І малочнай шакаладкай.
Запрасіў ён Веранічку,
Даў чырвоную сунічку,
А яшчэ наліў гарбаткі.
Толькі плача Веранічка—
Не хапіла шакаладкі.
А камарык загудзеў
І ў Валожын паляцеў.
Там ён купіць шакаладку
І духмяную гарбатку.

## ВЕРАНІКА І МАКСІМ

Вераніка
Невяліка,
А Максім

Малы зусім.
Зранку плачуць
І спяваюць—
Тату з мамай забаўляюць.

## СНЫ

Мне прысніўся бегемот,
Што стаптаў наш агарод.
У сястры страшнейшы сон—
Ёй прысніўся жоўты слон.
Ціха мы цяпер ляжым
І на брацікa глядзім.
Ну а ён спакойна спіць,
Пэўна, шакаладку сніць.

## ЯСЬ І СНЕГІРЫ

Як ліхтарыкі ў двары,
Чырванеюць снегіры.
Каб іх вецер не стушыў,
Ясь ім хлеба накрышыў.

## ВЕРАБ'І РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

У дзіравае каструлі,
Што была ў маёй бабулі,
На храмым старым сабаку,
Каб купіць на свята маку,
У Валожын з Пугачоў
Едзе дзесяць вераб'ёў.
Ім Максімка ўслед крычыць,
Просіць "Снікерсаў" купіць.
Вераб'і ж яго не чуюць,
Бо ўсе Шарыкам кіруюць.

## ГРОМА-САМАКАТ

Наш Максім сягоння рад—
Змайстраваў ён самакат.
З ім па вуліцы бяжыць,
Ажно вуліца дрыжыць.
І ад жаху рыжы кот
Да курэй уцёк на плот,
А сарокі-белабокі
Шуганулі за аблокі.
Ну а мухі-трапятухі
Адракліся ад мядухі,
А гудзелкі-камары
Аж памлелі на двары…
Выйшаў з хаты дзед Яўхім:
--Што за гуд? Аглух зусім!
--Гэта едзе наш Максім
Не на печы ці лапаце,
А на грома-самакаце!

## РАЗБУДЗІЦЕ МАМУ

Сёння да дачушкі
Прыляцелі птушкі,
Гучна ўсе спяваюць,
Спаць перашкаджаюць.
А яна не плача,
Як сінічка, скача:
--Разбудзіце маму!
З ёй пайду я ў краму,
Там куплю для мамы
Аж тры кілаграмы
Пернікаў мядовых,
Вішанек цукровых.
А сабе куплю
Тое, што люблю,
Толькі б сёння маму
Мне завесці ў краму.

## ПАКРЫЎДЖАНЫЯ КАМАРЫ

Сёння з ранку на двары
Танцавалі камары.
Камары-камарыкі—
Востранькія тварыкі.
Верабейка пралятаў
І танцораў разагнаў.

У цяністым у бары
Звонка плачуць камары.

## ІНДЫК ПРЫЕХАЎ З-ЗА МЯЖЫ

У двары курыны крык:
--Сёння дасць канцэрт індык,
Ён прыехаў з-за мяжы.
Каб спяваў ён ад душы,
Нам яму прынесці трэба
Грэчкі мех і торбу хлеба!

Певень крык курыны чуе,
Пад кустом адзін сумуе:
--Каб хто грэчкі мех мне даў,
Цэлы дзень яму б спяваў,
Нават польку б станцаваў!

## ПАДАРУНКІ ПЕЎНЮ

Пеўню на дзень нараджэння
З лесу ліс прынёс варэння.
Ад мядзведзя-лежабокі
Прынялі малін сарокі.
А барсук, бабёр і вожык
Падарылі зерня кошык.
Заяц, рысі і ваверкі—
Самакат, катацца з горкі.
Нават шэры воўк зубаты
Пеўню даў цукровай ваты.

Ну а наш маленькі Жэня
Пеўню на дзень нараджэння
Даў будзільнік сапсаваны,
Каб спаў певень кожны ранак
І ля хаты не хадзіў,
Жэню рана не будзіў.

## ГАСПАДАРЫ

Да майго суседа Мішы
Гаспадарыць ходзяць мышы.
Да маёй сяброўкі Райкі
Па капусту ходзяць зайкі.
А да нас у агарод
Гаспадарыць ходзіць крот.

## ПЕСНЯ СЛУГ
(да радыёказкі
“Сіняя світа навыварат шыта”)

Мы—слугі караля,
Мудрэй за ўсіх на свеце.
Нібыта жураўля,
Мы ў полі ловім вецер.

Наш бацюхна кароль,
Чаго на нас злуешся?
Мы ў моры зловім соль,
Смакуй сабе да цешся!

Мы зловім камара
І запражом у сані
І весела з двара
У свет паедзем самі.

Аб’едзем мы зямлю
І злётаем у неба
І знойдзем каралю
Усё, што толькі трэба.

Мы слугі караля,
Мы ведаем нямала.
І будзем мы пасля
За службу ў генералах.

ЛІЧЫЛКА

Мы купілі тэлефон,
Ды ў яго згубіўся звон.
Будзем мы адпачываць,
Ну а ты—той звон шукаць.

## ЗАГАДКІ

x x x

У гародзе пад кустом
Незвычайны вырас дом.
Трэба ратаваць гарод,
Бо жыве ў тым доме… (крот)

x x x

Яго пакінуў гаспадар
І сам паехаў на базар.
Ад дзвярэй ён не на крок,
Бо завуць яго… (замок)

x x x

Ён пад елкай сядзіць
І навокал глядзіць.
Ён не воўк, не баравік,
Ён звычайны… (лесавік)

x x x

Ён прыйшоў на Новы год,
Запрасіў у карагод,
Падарункі ўсім прынёс.
Ён завецца (Дзед Мароз)

СКОРАГАВОРКІ

х х х

У кашы мурашы
З шэранькаю мышкай
Шаршацелі шышкай:
--Шы-шы-шы, шы-шы-шы…

х х х

Бабёр другой не меў марокі,
Чым у сарокі браць урокі,
Як добрыя рабіць драбіны
З вярбіны шэрай і рабіны.

х х х

Ля шашы мурашы
Адшукалі грошык.
І за грошык вожык
Даў ажын ім кошык.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год